# ВОДЗЫЎ

на дысертацыю Калтачэнка Аліны Ігараўны

**«Адукацыйныя падарожжы магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы ў XVI–XVIII стст.»,**

прадстаўленую на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

**1. Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасці і галіне навукі, па якіх яна прадстаўлена да абароны**

Дысертацыйнае даследаванне А. І. Калтачэнка з’яўляецца самастойнай завершанай навуковай кваліфікацыйнай працай. У рабоце, якая грунтуецца на выкарыстанні шырокага кола гістарычных крыніц і спецыяльнай літаратуры, прадстаўлены новыя карысныя для гістарыяграфіі высновы, звязаныя з ажыццяўленнем магнатамі Вялікага Княства Літоўскага адукацыйных падарожжаў ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы ў XVI–XVIII ст., а менавіта разглядаюцца пытанні становішча саслоўяў, духоўнай культуры грамадства, асветы, адукацыі, культурных сувязяў Беларусі з іншымі краінамі, што адпавядае пашпарту спецыяльнасці “Айчынная гісторыя”, зацверджанаму загадам Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 01.06.2022 № 180.

Дысертацыя цалкам адпавядае спецыяльнасці, па якой прадстаўлена да абароны, 07.00.02 – айчынная гісторыя, а таксама галіне навукі – гістарычныя.

**2. Актуальнасць тэмы дысертацыі**

Прадстаўленая работа закранае шырокі пласт праблем, звязаных з эвалюцыяй асветы і адукацыі сярод вышэйшай салаўнай групы грамадства Вялікага Княства Літоўскага ў XVI–XVIII стст.

Актуальнасць даследавання Аліны Ігараўны Калтачэнка абумоўлена неабходнасцю навуковага аналізу з’явы адукацыйных падарожжаў магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ў вядучыя ўніверсітэты Заходняй Еўропы XVI–XVIII стст. Праблема патрабуе сістэмнага разгляду спецыфікі і адрозненняў названай практыкі ў параўнанні з адукацыйнымі падарожжамі іншых сацыяльных груп насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага, а таксама яе ўключэння ў агульнаеўрапейскі культурна-гістарычны кантэкст.

Аналіз гістарыяграфіі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы XX–XXI стст. у сукупнасці з даследаваннем падарожнай дакументацыі, якая маецца ў архіўных сховішчах, забяспечвае магчымасць рэканструкцыі арганізацыйных мадэляў і зместу адукацыйных падарожжаў магнатаў, а таксама выяўлення іх функцыянальнай ролі ў сістэме элітарнай адукацыі.

Даследаванне гісторыі адукацыйных падарожжаў магнатаў дазваляе ідэнтыфікаваць фактары ўзнікнення феномена выязной адукацыі ў XVI ст. і прасачыць яго структурныя трансфармацыі ў XVII–XVIII стст. Вызначэнне спецыфічных рыс выязной адукацыі магнатаў Вялікага Княства Літоўскага дазваляе прасачыць працэс інтэграцыі прадстаўнікоў магнацкіх сямей ў транснацыянальныя культурныя, рэлігійныя і палітычныя працэсы і структуры, а таксама акрэсліць месца традыцыі адукацыйных падарожжаў у фарміраванні

агульнаеўрапейскай мадэлі элітарнай адукацыі, што дагэтуль не было зроблена ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі.

**3. Ступень навізны вынікаў, атрыманых у дысертацыі, і навуковых палажэнняў, якія выносяцца на абарону**

Дысертацыя А. І. Калтачэнка з'яўляецца першым у гістарыяграфіі даследаваннем з'явы адукацыйных падарожжаў магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы ў XVI–XVIII стст. Навуковая навізна прадстаўленых палажэнняў грунтуецца на шырокім коле вывучаных аўтарам архіўных і апублікаваных дакументальных крыніц, частка якіх уводзіцца саіскальнікам у навуковы зварот упершыню.

Навізна вынікаў даследавання вызначаецца прымяненнем сістэмнага падыходу да праблематыкі, якой яно прысвечана, і ўвядзеннем у навуковы зварот новых крыніц. У працэсе даследавання быў акумуляваны вялікі масіў інфармацыі пра адукацыю прадстаўнікоў магнацкіх сем'яў, што дазволіла раскрыць змест адукацыйных падарожжаў, акрэсліць іх адрозненні ад падобных практык іншых сацыяльных груп насельніцтва, а таксама выявіць спецыфіку, абумоўленую канфесійнай прыналежнасцю і палітычнай арыентацыяй магнатаў.

Упершыню ў сучаснай айчыннай гістарыяграфіі быў праведзены аналіз і сістэматызацыя дакументальных матэрыялаў, якія адлюстроўваюць практыку адукацыйных падарожжаў магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы ў XVI–XVIII стст.

Увядзенне ў навуковы зварот новых матэрыялаў забяспечыла магчымасць рэканструкцыі пэўных адукацыйных падарожжаў асобных прадстаўнікоў магнацкіх сем'яў з высокай ступенню дакладнасці, што дазволіла лепш зразумець працэс транзіту ідэй Рэнесанса, Барока і Асветніцтва з Заходняй Еўропы ў Вялікае Княства Літоўскае.

**4. Абгрунтаванасць і верагоднасць высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі**

Абгрунтаванасць і верагоднасць высноў дысертацыйнага даследавання пацвярджаецца выкарыстаннем аўтарам апрабаваных айчыннымі і замежнымі даследчыкамі метадалагічных падыходаў. Прадстаўленая дысертацыя грунтуецца на прынцыпах аб'ектыўнасці, гістарызму і сістэмнасці.

Пры даследаванні праблематыкі паслядоўна выкарыстоўваліся як агульнанавуковыя, так і спецыяльныя гістарычныя метады. Саіскальнікам быў выкарыстаны вялікі аб'ём гістарычных крыніц з фондаў архіўных і бібліятэчных устаноў Беларусі, Літвы, Польшчы і Украіны. Таксама ў даследаванні былі выкарыстаны як класічныя, так і сучасныя напрацоўкі айчыннай і замежнай гістарыяграфіі. Агульны спіс выкарыстаных крыніц складае 542 адзінкі.

Шэраг напрацовак і высноў, зробленых аўтарам на старонках дысертацыі, пацвярджаецца прадстаўленымі ў асобным раздзеле дадаткамі. Сярод іх вылучаюцца паказальнік маршрутаў адукацыйных падарожжаў прадстаўнікоў

магнацкіх родаў і пералік лістоў, напісаных падчас падарожжаў сынамі Льва Сапегі, з пазначэннем месца захавання.

Навуковыя палажэнні і высновы дысертацыі сфармуляваны дастаткова карэктна і абгрунтавана, маюць завершаны характар, неабходную доказную базу.

**5. Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значнасць вынікаў дысертацыі з указаннем рэкамендацый па іх выкарыстанні**

Вынікі, атрыманыя дысертантам, маюць дастаткова высокую навуковую, практычную, эканамічную і сацыяльную значнасць.

Практычная значнасць вынікаў дысертацыйнага даследавання заключаецца ў іх выкарыстанні ў адукацыным працэсе на кафедры сацыянальна-гуманітарных дысцыплін турызму і гасціннасці ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай кульутуры" і магчымасці выкарыстання ў адукацыйным працэсе Дзяржаўнай установы адукацыі "Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы", што пацвярджаецца прадстаўленымі саіскальнікам адпаведна актам аб укараненні і даведкай аб магчымым практычным выкарыстанні вынікаў даследавання.

У эканамічнай і сацыяльнай сферы навуковыя дасягненні прадстаўленай дысертацыі могуць быць карыснымі пры развіцці сувязяў Рэспублікі Беларусь з замежнымі краінамі ў галіне культуры і адукацыі, стварэнні музейных экспазіцый, распрацоўцы турыстычных і экскурсійных маршрутаў.

Сабраны аўтарам факталагічны матэрыял і прадстаўленыя вынікі магчыма прымяняць у наступных гістарычных даследаваннях, прысвечаных гісторыі культуры і адукацыі, гісторыі саслоўяў у Новы час, стварэнні агульных і спецыяльных вучэбных праграм і курсаў па айчыннай гісторыі, краязнаўчых прац, манаграфій, артыкулаў па сацыяльна-палітычнай і канфесіянальнай гісторыі, гісторыі культуры і гісторы міжнародных сувязяў Беларусі ў Новы час.

**6. Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку**

Вынікі дысертацыйнага даследавання Аліны Ігараўны Калтычэнка былі апрабаваныя на 15 канферэнцыях розных узроўняў – нацыянальных і міжнародных. Высновы і галоўныя палажэнні даследавання прадстаўлены ў 24 публікацыях аўтара па тэме дысертацыі агульным аб'ёмам 11,9 аўтарскіх лістоў, з якіх 6 навуковых артыкулаў у выданнях, рэкамендаваных ВАК Рэспублікі Беларусь для друкавання вынікаў навуковых даследаванняў, 8 –у айчынных і замежных выданнях, 9 – у матэрыялах міжнародных і рэспубліканскай навуковых канферэнцый, 1 – раздзел у навучальным дапаможніку. Публікацыі ахопліваюць усе палажэнні, якія вынесены саіскальнікам на абарону.

**7. Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК**

Прадстаўленая кандыдацкая дысертацыя А. І. Калтачэнка афармлена ў адпаведнасці з патрабаваннямі ВАК і ўключае ў сябе такія раздзелы, як уводзіны, агульная характарыстыка працы, чатыры главы, заключэнне, спіс выкарыстаных крыніц і дадаткі, якія маюць цэласную лагічную структуру.

Агульныя палажэнні працы, у тым ліку палажэнні, якія выносяцца на абарону, а таксама заключэнне, у тым ліку асноўныя навуковыя вынікі дысертацыйнага даследавання, даслоўна выкладзены ў аўтарэферацe.

**8. Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе**

Навуковая кваліфікацыя А. І. Калтачэнка адпавядае вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя, што пацвярджаецца зместам, вынікамі і навізной дысертацыйнага даследавання.

**9. Заўвагі і пажаданні па дысертацыі і аўтарэфераце**

Ня гледзячы на агульную станоўчую ацэнку прадстаўленай дысертацыі, лічым неабходным выказаць некаторыя заўвагі:

назвы раздзелаў 3.3 і 3.4 главы 3 не зусім супадаюць з прыведзенымі ў змеце (у назвах "XVI–XVIII **ст.**", у змесце – "XVI–XVIII **стст.**") (с. 2, 74, 82);

на наш погляд, у першым палажэнні, якое выносіцца на абарону, больш правільна было б адзначыць, што часткай ранняй мадэрнізацыі, з'уляецца не рэформ**а** грамадства, а рэформ**ы** грамадства, і, адпаведна, што развівал**і**ся, а не развівал**а**ся дзяржаўная і прававая сістэмы (с. 9);

выклікае некаторае здзіўленне тое, што гістарыяграфічны агляд саіскальніца пачынае не з айчыннай, неглядзячы на яе невялікі памер, а з замежнай гістарыяграфіі (с. 13);

здаецца, што лепш было б выкарыстоўваць актуальная прозвішча выдатнай польскай даследчыцы Дароты Жоландзь-Стшэльчык, бо выкарыстанне ў адных месцах толькі дзявочага прозвішча, а ў іншых цяперашняга прыводзіць да неадпаведнасці з пэўнымі выданнямі (напрыклад, на с. 15 ужыта прозвішча Жоландзь-Стшэльчык у дачыннені да працы "Wychowanie szlacheckie w XVI i XVII wieku", дзе прозвішча аўтара Жоландзь);

пераблытаны месцамі спасылкі на крыніцы пад нумарамі 174, 175, 176, 177 і 178 на с. 19;

у аглядзе крыніц не вельмі зразумела, чаму аўтар, сцвярджаючы, што асноўнымі крыніцамі даследавання з'яўляюцца наратыўныя крыніцы (с. 21), свой аналіз пачынае не з іх, а з дакументальных крыніц (с. 20). У гэтым жа аглядзе матрыкулы еўрапейскіх універсітэтаў не аднесены да пэўнага віду гістарычных крыніц (с. 20), як і не класіфікаваны па асобных відах крыніц пашпарты, дазволы на выезд, творы вучняў, панегірыкі, silva rerum і г.д. на с. 23. Незразумела, як у групу наратыўных крыніц трапілі спісы выдаткаў падчас падарожжа (с. 21), якія законна трапілі ў склад фінансавых дакументаў, разгледжаных на с. 21;

у змесце дысертацыі яўна прасочваецца выкарыстанне антрапалагічнага, культуралагічнага і каштоўнаснага падыходаў, аднак саіскальніца чамусці не згадвае пра іх ужыванне ў раздзеле 1.3 "Метадалогія і канцэпцыя даследавання";

не зусім зразумела, як мэтай адукацыйнага падарожжа можа быць спіс неабходных для будучай кар'еры навук (с. 26), як універсітэт можа быць

передачай ужо знойдзеных ведаў і традыцый (с. 28) ці класіфікацыяй падарожжаў па мэце могуць быць студэнты, купцы, мастакі (с. 38);

не зусім абаснаваным здаецца сцвярджэнне аўтара аб тым, што на рашэнне Мікалая Радзівіла накіраваць сыноў Яна, Мікалая і Станіслава ў еўрапейскія ўніверсітэты паўплываў евангельска-рэфармацыйны багаслоў і дыпламат Ян Ласкі. Напэўна, тут на ўвазе маецца Ян Ласкі Малодшы, якому на той час было каля 20 гадоў і які яшчэ не праявіў сябе як дзеяч Рэфармацыі. Пры тым, што далей аўтар спасылаецца на карэспандэнцыю Яна Ласкага Старэйшага (с. 33, пазіцыя ў спісе літаратуры 243);

не зусім зразумела, у чым розніца адукацыйных маршрутаў каталікаў і пратэстантаў, калі саіскальнік на с. 52, 89 піша, што каталікі ехалі да паўднёвых нямецкіх зямель, а пратэстанцкі шлях ішоў да Германіі;

на наш погляд, на с. 75 патрабуе ўдакладнення, якую менавіта айчынную мову вывучалі прадстаўнікі магнатскіх сем'яў першай, так сама як і тое, хто маецца на ўвазе пад літоўскімі гісторыкамі, калі на с. 77 запісана "літоўскіх і польскіх (Ян Длугаш і Марцін Кромер)";

маецца шэраг апісак у тэрмінах і ўласных імёнах: у прозвішчы польскай даследчыцы Дароты Жоландзь-Стшэльчык аўтар згубіла літару "н" (с. 14, 15); не заўсёды ўжываецца "ь" у польскіх прозвішчах, якія маюць літару "ń" (напрыклад, Ф. Воланьскі (с. 16), Г. Балiньскі (с. 35, 63, 64); ізноў жа прозвішча Валаньскага па-беларуску трэбы пісаць з літарай "а" пасля "В" (с. 16); прозвішча Лукаша Гурніцага трэба ўжываць менавіта з "у", а не "а", бо ў польскай мове тут выкарыстана літара "ó" (с. 38); у прозвішчы літоўскага даследчыка Лаўрынаса Шедвы**дз**іса ў перадапошнім складзе замест "д" павінна быць "дз" (с. 17); у прозвішчы літоўскай даледчыцы Рынаты Суб**а**ткявічэне у другім складезе – "а", а не "о" (с. 17); імя па бацьку ўкраінскай даследчыцы Святланы Булатавай Алегаўна, адпаведна ініцыял павінен быць не "О", а "А" (с. 18); падаецца што ў беларускай мове прозвішча выдатнага прафесара Ростакскага ўніверсітэта павінна гучаць адпаведна польскаму варыянту – Давід Хітрэус, а не на англійскі манер Чатрэус (с. 30); імя Гуга ў беларускай мове павінна пісацца з "а", а не "о" на канцы (Гуга Калантай с. 45, Алевіанус, Донеллус с. 55), таксама як і прозвішчы Пр**а**хаска (с. 92), К**а**тлубай (с. 107), горад **А**рнэта (с. 93); Кёнігзберг трапляецца з літарай "с" замест "з" на с. 56, Сіена – без літары "і" на с. 64; на с. 66 трэба "з П**я**тром Нарубтам", а не "П**е**тром"; з прапіснай літары павінна быць напісана Біблія Марціна Лютэра (с. 30), таксама як Контррэфармацыя (с. 34), Парыжскі ўніверсітэт (с. 62), Нясвіжскі калегіум (с. 107); назва часткі інструкцыі напэўна павінна быць "E**x**empla…" E**ae**empla…" (с. 94); у прозвішчы аўтара № 254 са спісу літаратуры трэбы ўжыць "ź" замест "ż" Niedźwiedź;

адсутнічаюць кропкі пасля скарачэнняў "стст" (с. 4), "інш" (с. 4, 55, 89), "г" (с. 44), "гг" (с. 47), "г.д" (с. 90); ужыванне падвоенага скарачэння "стст." там, дзе трэба адзіночнае "ст." (с. 7 "ў другой палове XVI–XVII") і наадварот (с. 54, 80, 88);

у першым вывадзе па другой главе, напэўна, трэба было не "у XVI ст. у ВКЛ што" развіццё, а "ішло" развіццё (с. 50), а ў другой выснове па главе чацвёртай – "з вядзеннем ліставання", а не "літавання" (с. 113).

Пры гэтым хачу падкрэсліць, што выказаныя заўвагі і прапановы носяць дыскусійны і рэкамендацыйны характар, не ставаць пад сумніў высокую навуковую значнасць, не зніжаюць агульнай вартасці праведзенай саіскальніцай працы і не ўплываюць на агульную станоўчую ацэнку даследавання.

**10. Вывады і рэкамендацыі**

Кандыдацкая дысертацыя А. І. Калтачэнка "Адукацыйныя падарожжы магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы ў XVI–XVIII стст." з'яўляецца самастойнай кваліфікацыйнай навуковай працай і ўтрымлівае новыя тэарэтычныя і практычныя высновы і палажэнні. Даследаванне адпавядае спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя і галіне навукі – гістарычныя, змяшчае новыя навуковыя тэарэтычныя вывады па актуальным накірунку гістарычных даследаванняў.

Такім чынам, Калтачэнка Аліна Ігараўна ў адпаведнасці з п. 19 і п. 20 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў заслугоўвае прысуджэння навуковай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя за:

першае ў айчыннай гістарыяграфіі даследаванне з'явы адукацыйных падарожжаў прадстаўнікоў магнацкіх родаў Вялікага Княства Літоўскага ва ўніверсітэты і іншыя навучальныя ўстановы Заходняй Еўропы ў XVI–XVIII стст.;

выяўленне прычын ўзнікнення з'явы адукацыйных падарожжаў з тэрыторыі Беларусі ў XVI – першай палове XVII ст., вызначэнне іх асноўных функцый у сістэме элітарнай адукацыі і акрэсленне ролі гэтых падарожжаў у працэсе інтэграцыі Вялікага Княства Літоўскага ў агульнаеўрапейскую культурную і палітычную прастору;

грунтоўную характарыстыку змены ў другой палове XVII–XVIII ст. парадыгмы адукацыйных падарожжаў з "peregrinatio academica", калі галоўнай мэтай падарожжа былі ўніверсітэцкія веды, на гран туры, для якіх асноўнымі мэтамі былі ўдасканаленне атрыманай у Вялікім Княстве Літоўскім адукацыі, вывучэнне замежных моў, азнаямленне з гаспадарчымі, культурнымі і мілітарнымі аспектамі ў еўрапейскіх дзяржавах; вызначэнне адпаведных этапаў у эвалюцыі адукацыных падарожжах магнатаў Вялікага Княства Літоўскага;

вызначэнне спецыфікі адукацыйных падарожжаў магнатаў у параўнанні з прадстаўнікамі іншых саслоўных груп, сярод якіх наяўнасць "перасоўнага" двара, атрыманне вайсковай адукацыі поруч з вывучэннем некалькіх замежных моў, гісторыі, філасофіі і іншых навук для пашырэння эрудыцыі, наведванне тэатраў ваенных дзеянняў, а таксама вылучэнне галоўных асаблівасцей арганізацыі адукацыйных падарожжаў;

вызначэнне геаграфічных асаблівасцей магнацкіх адукацыйных падарожжаў ва ўніверсітэты Заходняй Еўропы ў XVI–XVIII стст., на якія

галоўны ўплыў аказваў канфесійны, а пасля разгортвання працэсу канфесіяналізацыі таксама палітычны фактар, а таксама індывідуальнага характару кожнага з адукацыйных падарожжаў;

выяўленне спецыфікі адукацыйных падарожжаў прадстаўнікоў найбольш уплывовых магнацкіх сем’яў Вялікага Княства Літоўскага на падставе дыярыушаў і эпісталярных крыніц, рэканструкцыю маршрутаў і этапаў пэўных падарожжаў асобных прадстаўнікоў родаў Сапегаў і Радзівілаў.

Афіцыйны апанент –
доктар гістарычных навук, прафесар,
першы прарэктар дзяржаўнай установы
адукацыі «Мінскі гарадскі інстытут
развіцця адукацыі» С.П.Стрэнкоўскі

12.01.2026

Подпись С.П. Стрэнковского
УДОСТОВЕРЯЮ
Начальник отдела кадров
О.В.Чернявская
«12» 01 2026 г.